Мэта даследвання ў сувязі з гэтым заключаецца ў вызначэнні складу архіва ў гэты час; вывучэнні зместу і прынцыпаў працы архівістаў, іх асабовага складу, вывучэнні шляхоў перамяшчэння архіву з Нясвіжу і звязанай з гэтым магчымай стратай дакументаў; выяўленні страт нанесеных архіву за гэты перыяд падчас апекі, разрабавання Нясвіжскага замку ў вайну 1812 г. і ў пасляваенны час, падчас перавозкі архіва ў Вільню і выкарыстання дакументаўураднікамі Радзівілаўскай Камісіі.

Методыка даследвання. Паколькі абазначаны хранaлагічны перыяд адносна іншых перыядаў для Нясвіжскага архіва азнаменаваўся бурнасцю яго гісторыі, то аб ім засталося параўнальна багата дакументальных сведчанняў, якія захоўваюцца ў складзе ф. №694 "Радзівілы, князі" Нацыянальнага Гістарычнага Архіва Беларусі, а таксама ў іншых архівасховішчах і зборах у тым ліку замежных. Такім чынам шляхам архіўнай эўрыстыкі здзейснена выяўленне дакументаў цікавячай тэматыкі і праведзены іх крыніцазнаўчы (знешняя і ўнутраная крытыка), гісторыка-генетычны аналіз. Апрацавана навуковая літаратура па дадзенай праблеме. У працэсе даследвання выкарыстаны як агульнанавуковыя, так і спецыяльна-гістарычныя метады (у тым ліку псіхагістарычны аналіз справаздач, ліставання, успамінаў архіварыюсаў).

Такім чынам, у гісторыі Нясвіжскага архіва кн. Радзівілаў перыяду 1790-1838 гг. можна абазначыць наступныя этапы:

I.1790 -1805 гг.- перыяд апекі над непаўнагадовым кн. Дамінікам Радзівілам. Апекуном кн. Міхаілам Радзівілам архіў вывозіцца ў Варшаву і Нябораў. К 1805 г. па дасягненні паўнагадовасці кн. Дамініка ён вяртаецца ў Нясвіж архівістам Францішкам Асіповічам, але частка дакументаў застаецца ў кн. Міхаіла.

II.1805 – 1813 гг. перыяд дзейнасці кн. Дамініка Радзівіла. Упарадкаванне дакументаў архівістам Ёзафам Дмахоўскім. Кн. Дамінік Радзівіл падтрымлівае Напалеона. Яго маёнткі канфіскоўваюцца Расійскімі ўладамі. Падчас вайны 1812 г. разрабоўваецца Нясвіжскі замак, і, у прыватнасці, архіў. Дакументы раскіданы па замкавых валах, разнесены жыхарамі па горадзе. Найбольшыя страты і пашкоджаніі панеслі дакументы з пячаткамі (срэбныя і залатыя апраўы). Рабаўніцтва працягвалася і пасля вайны падчас размяшчэння ў замку вайсковага шпіталю.

III.1814-1838 гг. – перыяд дзейнасці Радзівілаўскай камісіі па разбору ўладанняў паміж спадкаемцамі. Суцэльны вываз архіва ў Вільню, актыўнае выкарыстанне (часам бескантрольнае) дакументаў у справах Камісіі і рознымі службовымі асобамі, шматлікія выпадкі невяртання і знікнення дакументаў з архіва. Дзейнасць на пасадзе архіварыюса Мікалая Маліноўскага, навядзенне парадку ў выдачы дакументаў, іх навуковая апрацоўка. Заканчэнне дзейнасці Камісіі і вяртанне архіва ў Нясвіж.

У межах дадзеных этапаў выдзяляюцца і перыяды працы асобых архівістаў.

## У ИСТОКОВ АНГЛИЙСКОГО ЛИБЕРАЛИЗМА: ДЖОН ЛОКК

***М.М. Лисейкова***

Научный руководитель – к.и.н., доцент ***Н.Н. Мезга***

*Гомельский государственный университет им. Ф. Скарины*

Основной целью данной работы является выделение и изучение наиболее существенных позиций в локковской теории о государстве и естественных правах человека как основе либеральной социально-политической концепции.

Англия стала родиной либерализма, ведущей идейно-политической традиции современной западной цивилизации, так как именно здесь сложились необходимые социально-экономические и политические предпосылки для этого.

Английская буржуазная революция середины XVII и "славная революция" послужили толчком для дальнейшего развития либеральных принципов, выразителем которых стал один из основоположников европейского либерализма Джон Локк. Его жизнь и творчество персонифицировали в себе идеи этих революций и способствовали их дельнейшему развитию. Как писал Э.Ю. Соловьёв, «Локк оказался великим толкователем нарождающегося правосознания, сумевшим зафиксировать и высказать такие его установки, которые не только

сохранили свою социальную действенность на протяжении всего XVII в., но и в известном смысле оказались «навечными».

В основе всех этих институтов лежит разработанная Локком концепция *естественных прав,* которые неразрывно связаны с естественным состоянием человека. Его Локк рассматривает для того, чтобы правильно понять и определить источник политической власти: «Это состояние полной свободы относительно их действий и в отношении распоряжения своим имуществом и личностью в соответствии с тем, что они считают подходящим для себя в границах закона природы, не испрашивая разрешения другого лица и не завися от чьей-либо воли. Это также состояние равенства, при котором вся власть и вся юрисдикция являются взаимными, – никто не имеет больше других.» В отличие от многих своих предшественников, он не считает, что это состояние приводит в конце концов к войне всех против всех. Он полагает: «Естественное состояние имеет закон природы, которым оно управляет и который обязателен для каждого, и разум, который является этим законом, учит всех людей, которые пожелают с ним считаться, что поскольку все независимы постольку ни один из них не должен наносить ущерб жизни, здоровью, свободе или собственности другого».

Переход от естественного состояния к гражданскому обществу осуществляется на основании общественного договора по воле и решению большинства. Это и переносит человека из естественного состояния в государство.

В двух «Трактатах о государственном правлении» Локк формирует три основных прирождённых права личности, которые индивиды признают друг за другом в естественном состоянии и которые затем гарантируются самим государством: это право на жизнь, свободу, собственность.

Право на свободу обусловлено тем, что каждый человек рождается свободным также как разумным. Локк пишет: «Свобода человека и свобода поступать по собственной воле основывается на том, что он обладает разумом, который в состоянии научить его тому закону, по которому он должен управлять собой, и дать ему понять, в какой степени у него остаётся свобода его собственной воли». Государственные же законы создаются не для того, чтобы уничтожать, ограничивать свободу, а для её сохранения и расширения.

Нарушением права на жизнь является уже всякое закабаление человека, всякое насильственное присвоение его производительных возможностей.

Право на собственность и свобода дают человеку широкий спектр возможностей для реализации своего «Я», которое может выражаться в выборе призвания, в определении целей, в нестеснённой совести и слове.

Таким образом, Локк формирует новый политико-юридический идеал нового общественного устройства, в которой человек имеет триединую основу: субъект независимых убеждений – труженик – собственник. Государство в этом случае выступает как защитник естественных прав индивида.

## СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЕ ПАДАТКААБКЛАДАННЕ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941-1944)

***С.Л. Казлова***
Навуковы кіраўнік – д.гіст.н. ***А. М. Літвін***
*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Тэма падатковай палітыкі нямецкіх акупацыйных уладаў на тэрыторыі заходнебеларускай вёскі слаба даследавана ў беларускай гістарычнай навуцы, негледзячы на тое, што ўяўляе сабой вялікую навуковую цікавасць. У дадзеным даследванні былі выкарыстаныя архіўныя дакументы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Сутнасць падатковай палітыкі нямецкіх акупацыйных уладаў залежала ад раскладу сіл на франтах і тых сацыяльна-эканамічных мэт, якія ставілі перад сабой фашысты ў розныя гады вайны.